*Прачытаў — перадай суседу!*

# Вольная СЕРАБРАНКА

МЯСЦОВАЯ ГАЗЕТА НЕЗАЛЕЖНАГА ГРАМАДСТВА

№ 3 (15) сакавік 2009

БНФ бярэ прыклад з Польшчы? **(старонка 2)**

Браты меншыя просяць дапамогі **(старонка 4)**

Дзе навучыць малых дзетак роднай мове? **(старонка 5)**

Конкурс прыгажосці "Срэбраная зорка" **(старонка 6)**




**Дзень Волі...**
**Такім сапраўды святочным Ён быў у 2007-м.**
**Што чакае на сёлета?**

***(глядзі с. 2)***

МАЛЫ БІЗНЕС

# Рынкавы індыкатар

Паводле супрацоўнікаў рынку "Свелта", справы ў прадпрымальнікаў пагаршаюцца. Дзяржава падвысіла падаткі, а пакупнікоў рэзка паменела.

Пад ціскам стыхійных пратэстаў пасля разавай дэвальвацыі напачатку года ўдалося дабіцца зніжэння арэндных ставак на 20%, аднак арэндныя плацяжы працягваюць налічацца ў еўра, і ад "паўзучай" дэвальвацыі ніхто не абаронены.

Урад з новага года павялічыў каэфіцыент, які прымяняецца да стаўкі адзінага падатку і НДС з 1,5 да 2-х, гэта значыць плаціць даводзіцца на 33% болей. Акрамя павелічэння падатковай нагрузкі прадпрымальнікі сутыкнуліся з рэзкім падзеннем попыту насельніцтва на пэўныя катэгорыі тавараў. Людзі адкладаюць набыццё дарагіх, але не жыццёва неабходных рэчаў да лепшых часоў. Гэта ў першую чаргу тычыцца вопраткі. Напрыклад, калі раней у сакавіку ў адной гандлёвай кропцы куплялі 10-15 скураных куртак, то зараз 1-2.

Многія ледзь зводзяць дэбет з крэдытам, і пакуль не бачаць выйсця з гэтага тупіка. У той жа час шмат хто з прадаўцоў і прадпрымальнікаў лічаць, што менавіта існуючыя улады вінаватыя, што сусветны фінансавы крызіс так балюча адбіўся на нашай краіне. Менавіта ўрад Лукашэнкі 10 апошніх год на ўсе лады расхвальваў, як выявілася, нежыццяздольную беларускую эканамічную мадэль, а не праводзіў рынкавыя рэформы.

**Артур Лагодны**

СВЯТЫНІ


ЮРАСЬ НАВІЦКІ

# Забітая капліца

Меншы як 80 гадоў мінула з тых часоў, калі на мяжы Серабранкі й Лошыцы існаваў каталіцкі збор – капліца (невялікі касцёл) у імя Нараджэння Св. Панны Марыі.

У 1935-м, падчас чацвёртай і самай жудаснай хвалі генацыду беларускага народа, развязанага камуністычным рэжымам, і чарговай "бязбожнай пяцілеткі 1933–1937 гг.", збор быў амаль цалкам знішчаны. Амаль, бо вандалам папросту не хапіла выбухоўкі. Сёння на тым месцы засталіся толькі руіны – маўклівыя сведкі злачынстваў савецкай улады, ды крыж "ПАКУТНІКАМ ЗА БЕЛАРУСЬ" працы вядомага беларускага мастака Міколы Купавы (1995 г.). Больш шырока аб гісторыі святыні распавёў на старонках сваёй кнігі "Аповеды старасвецкай Лошыцы" (2005 г.) серабранаўскі краязнаўца, даследчык гісторыі Мінска і пісьменнік Юры Кур'яновіч.

**Юрась Рыжкаў**

ЗДАРЭННЕ

# У Серабранцы сутыкнуліся трамваі

Сутыкненне двух вагонаў адбылося на разваротным трамвайным кальцы «Серабранка». Пацярпела адна жанчына.


АРТУР ЛАГОДНЫ

Нешта адцягнула ўвагу жанчыны-кіроўцы, і яе вагон сутыкнуўся з тым, што стаяў наперадзе. Другая жанчына, што была ў салоне, моцна пацярпела: у яе адкрытая чэрапна-мазгавая траўма і пералом аснавання чэрапа.

Чалавек, якога дыспетчар станцыі прадставіла як свайго кіраўніка, паведаміў нашаму карэспандэнту, што аварыя адбылася 5 сакавіка, а не 6-га, як паведамлялася раней у іншых СМІ. Дарэчы, у паведамленні БелТА прайшла інфармацыя, што пацярпела пасажырка, а БелаПАН паведамляе са спасылкай на ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, што пацярпела вагонаважатая.

Усе ўдзельнікі надзвычайнага здарэння былі цвярозыя. Пацярпелая дастаўлена ў бальніцу хуткай дапамогі. Па факце аварыі праводзіцца праверка.

Па назіраннях месцічаў, у Серабранцы часта здараюцца праблемы з механізмам пераводу стрэлак, з-за чаго на трамвайным коле збіраецца шмат трамваяў, якія не могуць раз'ехацца. Дарэчы, на гэтым коле жанчыны-кіроўцы дасюль перакідаюць рэйкі … ломам.

**Юрась Навіцкі**

ДЗЕНЬ ВОЛІ

# БНФ хоча стаць "Салідарнасцю"

Кіраўніцтва Партыі БНФ лічыць, што Лукашэнка не ўратуе краіну, але ён павінен цалкам адказаць за збядненне беларусаў. Пра гэта было сказана на сходзе Мінскай гарадской арганізацыі ПБНФ, які адбыўся 9 сакавіка.

Кіраўніцтва ПБНФ запрашае беларусаў (найперш мінчукоў), якіх не задавальняе сацыяльна-эканамічная і палітычная сітуацыя, прыйсці 25 сакавіка а 18 гадзіне на плошчу каля Акадэміі Навук, каб заклікаць кіраўніцтва Беларусі да адказу за правалы ў эканоміцы.

– Мы зможам дамагчыся таго, каб з намі лічылася ўлада і паважаў Захад толькі тады, калі выйдзем на вуліцы шматтысячнай маніфестацыяй. Партыя БНФ намерана выйсці на Дзень Волі з нацыянальнымі, дэмакратычнымі і сацыяльнымі лозунгамі, – заявіў намеснік ПБНФ Віктар Івашкевіч.

На думку кіраўнікоў ПБНФ, упылыў крызісу пашыраецца на Беларусь, народ бяднее. Зараз эксперты партыі не могуць распрацоўваць нават рэкамендацыі па пераадоленні крызісу, бо няма дакладнай інфармацыі пра яго праявы (улады ўсяляк яе хаваюць). Іншыя палітычныя структуры, прафсаюзы таксама маўчаць. Атрымліваецца так, што Партыі БНФ застаецца агучваць сацыяльныя патрабаванні, стаць аналагам польскай "Салідарнасці".

– Мы не маем права адседжвацца і мусім узняць нацыянальны штандар, бо ў адваротным выпадку над намі залунае расійскі трыкалор, – лічыць намеснік ПБНФ Вінцук Вячорка.

Сп. Вячорка дадаў, што шматлікія міжнародныя партнёры будуць адсочваць правя-дзенне акцыі.

**Артур Лагодны**

**Сёлетняя акцыя 25 сакавіка (угодкі абвяшчэння незалежнасці БНР), будзе несці палітычны і сацыяльны характар: пратэсты супраць сацыяльнай палітыкі ўраду і супраць зняволення палітычных актывістаў. Нагадаем, што ў пададзенай у Мінгарвыканкам заяўцы казалася пра збор а 18-й гадзіне 25 сакавіка на пляцоўцы перад будынкам Прэзідыума Акадэміі Навук і шэсце праспектам да Кастрычніцкай плошчы.**

ГАСПАДАРКА

# Як зберагчы свае грошы

Парады пра тое, як пазбегнуць падману на рынку, а таксама карысна і эканомна харчавацца дае чытачка **Алена Цыбуля**.




МАЛЮНАК ЮРАСЯ НАВІЦКАГА

Даўно сачу за Вашай простай і даступнай газетай і нарэшце вырашыла стаць яе карэспандэнтам, падзяліцца досведам, які, магчыма, стане карысным у гэты складаны час.

Я думаю, кожны адчуў на сабе, як з кожным днём нашы даходы ўсё менш дазваляюць якасна харчавацца, купляць неабходнае, адпачываць, карацей – жыць паўнавартасна.

### Свабодны рынак

Дзе на невялічкія даходы пенсіянераў купляць танныя прадукты? Вядома – на рынку. Спачатку трэба патраціць час і грошы на транспарт, каб выбраць той, які больш падабаецца, дзе тавары з аптымальным спалучэннем цаны і якасці. Я раю набываць прадукты на Камароўцы, асабліва ў будні. Хоць жыхарам Серабранкі давядзецца патраціць час на даезд, там большы выбар, таннейшы тавар і парадку болей.

Я вельмі паважліва стаўлюся да прадаўцоў. У іх вельмі цяжкая праца і не заўсёды ўдзячная. Але сярод іх бываюць і не вельмі сумленныя.

### Абвес

Такі від падману не вельмі зараз папулярны. Па-першае, за гэта вельмі лёгка страціць сваё месца працы. Адміністрацыя рынку цырымоніцца не будзе. Па-другое, ёсць шэраг іншых больш надзейных спосабаў нажыцца за кошт разяватага пакупніка.

### Не больш за два ў адны рукі

Калі Вы набіраеце ў аднаго прадаўца шмат адзінак тавару (рознай гародніны ці садавіны), гандляр праводзіць арыфметычныя аперацыі з касмічнай хуткасцю. Не заўсёды гэта можа быць абумоўлена жаданнем хутка і якасна абслужыць пакупніка. Часам несумленны прадавец можа “памыліцца” ў лічбе на калькулятары на сваю карысць. Таму парада такая: больш чым 2 адзінкі прадуктаў у адным месцы лепей не браць. Тады вы зможаце лёгка правесці альтэрнатыўны падлік і выкрыць ману. Зараз у пост у беларусаў вельмі папулярныя сухафрукты. Для іх набыцця (з-за дарагоўлі гэтага тавару) гэтая парада асабліва актуальная.

### Калькуляцыя

Парада другая: набудзьце калькулятар. Не саромейцеся ім карыстацца, і ён акупіцца вельмі хутка.

### Сталы кліент

Парада трэцяя: выбраць 1-2 сталых прадаўцоў на рынку і толькі да іх хадзіць. Вам іншым разам параяць лепшы кавалачак ці гатунак, зробяць зніжку. І хітрыць з Вамі не стануць, каб не страціць давер сталага кліента.

### Адкрытасць

Парада чацвёртая: калі прадавец набірае Вам у пакет садавіну ці гародніну, прасіце, каб ён вяртаў Вам торбу незавязанай. Тады Вы мелькам зможаце ацаніць якасць пладоў і своечасова абмяняць тое, што не падабаецца.

### Грошы

Нават калі гэта невялікая сума, нельга ўсё класці ў адно месца. Апошнім часам усё больш спецыялістаў, якія ўмеюць спрытна красці, а нам дарагі кожны рубель. У гэтым выпадку нават простая ўпакоўка з-пад таблетак можа стаць Вам надзейным памочнікам.

### Вітаміны

Яе можна здабываць у... сваёй кватэры. Пятрушку, кроп, цыбулю можна без праблемаў вырошчваць у хатніх умовах. Пасадзіў замест фікуса – і прыгожа і карысна. Але

*Калі прадавец набірае Вам у пакет садавіну ці гародніну, прасіце, каб ён вяртаў Вам торбу незавязанай.*

ж калі Вы хочаце купляць зяляніну на рынку, абавязкова рушце на Камароўку. 100 г. зелені за 2 тысячы хопіць на добры тыдзень. На серабранаўскім рынку за тыя ж грошы набудзеце пучок у грам 20-30. Увогуле дэфіцыт вітамінаў вясной асабліва адчувальны. Раю таксама звярнуць увагу на беларускія моркву, тапінамбур, капусту, цыбуліну, бурачок.

Жадаю Вам, шаноўныя чытачы, цярплівасці, веры, духоўнасці і надзеі, што ўсё ў нас будзе цудоўна, каб у Вас усё было добра, а потым яшчэ і палепшыла.

ЖЫВОЕ

# Браты меншыя ў пошуках гаспадароў

**Жыхарка Серабранкі, валанцёрка КП "Фауна горада" Вальжына Парашутава пагадзілася распавесці чытачам нашага выдання пра праблему бяздомных котак і сабак**

– Па-першае, хачу выказаць вялікую падзяку ўсім, хто дапамог выкінутым, беспрытульным дваровым жывёлам перажыць чарговую суворую зіму. Без вашай падкормкі і чалавечай увагі мала каму з іх давялося б пабачыць вясновае сонейка. Шчыра схіляю галаву і перад тымі людзьмі, каго не спынілі завараныя ЖЭСамі падвальныя адтуліны. Асабіста ведаю жанчыну, якая перыядычна выходзіла па начах з інструментамі і ўскрывала закратаваныя адтуліны там, дзе апекаваныя ёю каты апынуліся ноччу ў маразы без усялякай магчымасці кудысьці схавацца.

**– Чаму праблему бяздомных жывёлаў не заўважаюць чыноўнікі?**

– У нас дагэтуль не прыняты закон аб абароне жывёлаў. Некалькі разоў яго праект выносіўся на разгляд, але нашыя парламенцёры штораз прымалі рашэнне адхіліць яго з-за неактуальнасці. У мяне складваецца ўражанне, што нашае чынавенства ў асноўнай масе лічыць катоў і сабак, якія воляю чалавека апынуліся на вуліцы, смеццем. А раз гэта смецце, то яго трэба прыбраць, каб не кідалася ў вочы. Але ж усе гэтыя адловы, адстрэлы замураваных у падвалах котак, так, бывае і такое, бачаць людзі. І ім баліць.

**– Што ў гэтым разе могуць зрабіць простыя жыхары раёна?**

– Не так ужо і мала. У адрозненне ад уладаў, стаўленне да жывёлінаў у людзей пачынае змяняцца ў лепшы бок. У першую чаргу на гэта паўплывала трансляцыя ўсясветнага канала Animal Planets. У ім у даступнай ненавязлівай форме паказваецца тое, як на самой справе павінны суіснаваць чалавек і жывёла. Людзі пачалі разумець, што ва ўсім цывілізаваным свеце шкадаваць і апекаваць беспрытульную жывёлу – гэта не смешна, і займаюцца гэтым не толькі самотныя старушкі.

**– Хтосьці скажа, што ў нашых маленькіх кватэрах складана трымаць і адну сабаку...**

– На першы погляд так, але, як гэта ні парадаксальна, трымаць у хаце



АРТУР ЛАГОДНЫ

Гэтаму сабаку пашанцавала. У яго ёсць гаспадыня.

дзве жывёліны прасцей, чым адну. Нашыя пухнатыя сябры адчуваюць тыя самыя эмоцыі, што і мы, ім сумна заставацца ў адзіноце пакуль мы знаходзімся на працы. З-за гэтага пачуцця адзіноты сабака можа наносіць пашкоджанні не толькі вашай маёмасці, але нават і сабе. У катоў пачуццё пакінутасці можа потым вылівацца ў агрэсію да гаспадара. У мяне ў самой кот быў даволі суворы і кусачы, калі я клалася спаць ён паляваў на мяне, як на лань. Але са з'яўленнем у кватэры другога ката яго ваяўнічасць знікла бясследна. Так што не трэба баяцца заводзіць другую жывёліну, усё гэта толькі на карысць.

**– Вы займаецеся валанцёрскай працай на "Фауне Горада". Раскажыце, што там адбываецца.**

– У адрозненні ад агульна прынятага меркавання "Фауна Горада" не з'яўляецца прытулкам для адлоўленых на вуліцах жывёлаў. На жаль, гэта пункт часовага утрымання. На дадзены момант 5-дзённага. Жывёлы там утрымліваюцца не ў лепшых умовах. Напрыклад, сабакі стаяць у вальерах пры вулічнай тэмпературы, зімой вада у місках замярзае. Кормяць іх адзін раз у суткі. З-за аднаразовага харчавання вялікай колькасцю кашы шмат у каго з сабак пачынаецца панос, а гэта фармальная нагода для ўмярцвення. Я не люблю, калі выкарыстоўваюць слова "усыпленне", бо гэта ілюзія. Ад тых прэпаратаў, якімі карыстаюцца ветэрынары, жывёла не засынае. Іх дзеянне заснавана на блакадзе дыхацельнага цэнтра, жывёла проста задыхаецца. Укол робіцца ў сэрца, гэта даволі балюча, пра абязбольваючыя прэпараты ветэрынары не хочуць чуць.

Але самае сумнае, што сабакам і катам, якія часова ўтрымліваюцца на ФГ ніхто, пры наяўнасці ў штаце ФГ трох ветэрынараў, не аказвае ветэрынарную дапамогу. Гэта ўсё робяць звычайныя людзі, валанцёры, якія набываюць за свой кошт лекі і па магчымасці знаходзяць ім новыя сем'і. Звяртаюся да неабыякавых людзей, мы прымаем дапамогу ў любым выглядзе: прадуктамі, лекамі, грашыма на правядзенне аперацый па сцерылізацыі, пастаянна патрэбна дапамога рукамі, бо сабак трэба выгульваць, а катоў лячыць і карміць. Нават калі ў вас ёсць магчымасць прыязджаць усяго некалькі разоў на месяц гэта найлепшым чынам адлюструецца на агульнай сітуацыі на ФГ. Больш падрабязна пра патрэбную дапамогу можна даведацца на сайце ГА абароны жывёл "Эгіда" egida.ucoz.ru, патэлефанаваць па тэлефоне (8-023)772896 ці звярнуцца на вул. Гурскага, 42.

**Запісаў Артур Лагодны**

## Парады ад Вольгі

**1. Не трэба выпускаць хатніх жывёлаў на прагулкі на вуліцы адных. Лаўцам усё роўна, што вашая сабака дагледжаная, а котка з ашыйнікам, яны грабуць усё, што бачаць. Прывучаную жывёлу лягчэй злавіць, яна сама ідзе ў рукі.**

**2. Калі падкармліваеце катоў пад пад'ездам прывучайце іх прыбягаць да вас не на гук Кіс-кіс (яго ведаюць усе лаўцы), а на што-небудзь арыгінальная, напрыклад, Мышы-мышы.**

**3. Абавязкова набудзьце свайму сабаку ашыйнік-адраснік (прадаюцца ў кіёсках, дзе робяцца ключы) з тэлефонамі, па якіх трэба тэлефанаваць, калі хто знойдзе вашу згубленую сабаку. Паверце, людзі з радасцю падбіралі б усіх згубленых сабачкаў, каб яны былі з тэлефонамі.**

**4. Калі ваш гадаванец згубіўся, шукайце яго не толькі па раёне, не чакайце больш за 5 дзён, едзьце на Гурскага, 42. Магчыма, першы раз вы яго там не знойдзеце. Але прыязджайце зноў і зноў. Заўсёды памятайце – ён чакае калі вы яго ўратуеце.**

ПЫТАННІ І АДКАЗЫ

# Дзе навучыць роднай мове?

**Чытачку Алу цікавіць, ці ёсць у нашым раёне дзіцячыя садкі, школы, гурткі, дзе для дашкольнікаў праводзяцца хоць якія заняткі па-беларуску? Як аказалася, знайсці такія месцы ў нашым раёне зусім няпроста.**



МАЛЮНАК ЮРАСЯ НАВІЦКАГА

На пытанне па просьбе рэдакцыі адказаў старшыня Таварыства беларускай школы Алесь Лозка:

–У Ленінскім раёне ёсць дзіцячыя садкі, дзе для выхаванцаў штотыдзень праводзіцца беларускамоўны дзень. Яны месцяцца на праспекце Партызанскі, 85а (№ 202, тэл. загадчыцы: 2954067) і на вул. Якубава, 60 (Садок № 101, тэл. загадчыцы: 2208861). Такога, каб праводзіліся ў іншых тыповых дашкольных установах дадатковыя заняткі менавіта на беларускай мове, бадай, няма.

Як даведалася рэдакцыя “ВС”, дзіцячы садок № 403, што на Якубава, 42 (тэл. загадчыцы: 2472081) мае нават адну беларускамоўную групу.

– Група была сфарміравана з дзетак трохгадовага ўзросту. У нас ёсць дзве выхавацелькі, якія вядуць гэтую групу. Не выключана фарміраванне дадатковых групаў, калі будзе на тое жаданне бацькоў, – кажа загадчыца садка Ала Міхайлаўна.

У пошуках адказу на пытанне мы звярнуліся таксама ва Упраўленне адукацыі адміністрацыі Ленінскага раёна. Як нам паведамілі, для дашкольнікаў, на жаль, беларускамоўных гурткоў у раёне са стотысячным насельніцтвам няма. Дзеці школьнага ўзросту, па словах чыноўніцы, могуць займацца па-беларуску на базе 28-й гімназіі (пр. Ракасоўскага, 93, тэл.: 2483202).

– Сапраўды, пры нашай гімназіі дзейнічае нядзельная беларускамоўная школка для малых дзетак. Мы ім выкладаем чытанне, матэматыку, маляванне і нават французскую мову. З дзеткамі таксама працуе дэфектолаг. Увогуле ў нашай гімназіі, ў адрозненні ад звычайных сярэдніх школ, па-беларуску выкладаюцца усе прадметы. Асаблівасць нашай навучальнай установы – паглыбленае вывучэнне французскай мовы, – кажа настаўніца гімназіі Наталля Дабравольская.

Атрымліваецца, што ў Ленін-скім раёне, дзе пражываюць сотні тысячаў жыхароў, месцаў, дзе дашкольнікі могуць размаўляць па-беларуску, вобмаль. Свае парады пра тое, як змяніць сітуацыю, спрабуе даць былая выхавацелька беларускага дзіцячага садка спадарыня Наталля:

– Я лічу, бацькі павінны ўсвядоміць, што веданне роднай мовы – абавязковая ўмова для гарманічнага развіцця чалавека. Яны не павінны быць пасіўныя ў вырашэнні гэтага пытання. Улады ж мусяць паклапаціцца пра выхаванне і навучанне на мове тытульнай нацыі дзетак усіх ахвотных бацькоў.

**Артур Лагодны і Міхась Жук**

АСЯРОДАК

# Машына ёсць – паркоўкі няма



АРТУР ЛАГОДНЫ

**У рэдакцыю паскардзілася жыхарка дому № 55 па Ракасоўскага. Яна наракала на тое, што ўладальнікі аўтамашын пакідаюць сваіх “жалезных коняў” на дзіцячай пляцоўцы.**

Журналісты “ВС” на ўласныя вочы пераканаліся, што калі жанчына перабольшвала, то не нашмат.

– Двор увесь застаўлены машынамі. Тутака ўсюды машыны. Вы ж бачыце. Патрэбна вырашаць гэтую праблему. Летам немагчыма прайсці па тратуару, дыхаць немагчыма, – паскардзілася журналістам кабета з дому № 55 па Ракасоўскага.

Праезд з абодвух бакоў быў шчыльна застаўлены легкавікамі. Размешчаныя пад вуглом дзевяціпавярховікі забудовы 1970-х гадоў № 55 і № 49 не пакідаюць ніякіх шансаў на цывілізаваную паркоўку ўладальнікам прыватных легкавікоў. Трэба прызнаць, што такая праблема існуе амаль ва ўсіх дварах панельнай забудовы часоў СССР.

Спецыяліст, да якога мы звярнуліся, патлумачыў сітуацыю тым, што ў савецкі час будаўнікі спяшаліся выконваць жыллёвую праграму і стварэннем прадугледжаных СНіПам стаянак і гасцявых парковак папросту грэбавалі. Нават тыя невялічкія стаяначкі, што ёсць у тупіках старой панельнай забудовы, насамрэч з’яўляюцца разваротамі. Сітуацыя ўскладнілася даволі рэзкім ростам аўтамабілізацыі насельніцтва. Калі пры пабудове дамоў у людзей было да 30 машын на тысячу жыхароў, то цяпер гэты паказнік у сталіцы складае больш за 260. Апошнія гады сталічнае кіраўніцтва замест спробы вырашыць сітуацыю з паркоўкамі, практыкавала так званую “ушчыльненую забудову”, утыркаючы ў спальных раёнах на любым вольным кавалачку зямлі сучасны хмарачос. Гэта яшчэ больш ускладніла праблему і, выглядае на тое, што выйсця з яго мясцовым чыноўнікам пакуль не бачыцца.

**А. Л.**

СМІ І УЛАДА

# Загадана: Не пушчаць! альбо Феномэн “савецкае канс’ержкі”

Жыхары дома № 64 па Ракасоўскага дзякуючы тамашнім гаспадыням пад’езду не атрымалі належныя ім асобнікі газеты “Вольная Серабранка”.




МАЛЮНАК ЮРАСЯ НАВІЦКАГА

Ва ўзгаданым шматпавярховіку на абарону паштовых скрыняў ад вольнага слова літаральна груддзю сталі дзве жанчыны, што сказаліся “канс’ержкамі” (прозвішчы, зразумела, свае яны назваць адмовіліся). Так бы мовіць, гаспадыні пад’езда не дазволілі пакінуць для жыхароў дома аніводнага асобніка газеты. (Аўдыёзапіс размовы можна паслухаць на сайце **http://serabranka.at.tut.by**)

З-за кур’ёзнага выпадку жыхары шматпавярховага “слупка” былі пазбаўлены права на атрыманне інфармацыі, якое гарантаванае Канстытуцыяй Беларусі. А інфармацыя была сапраўды цікавая. Большасць артыкулаў нумару датычныя менавіта згаданага кварталу Серабранкі. У газеце нашыя карэспандэнты ўзгадалі гісторыю з’яўлення Шэпічаў, паспачувалі супрацоўнікам адміністрацыі, пахвалілі працу інспектараў раённай службы занятасці, пакрытыкавалі будаўнікоў тамтэйшае дзіцячай пляцоўкі і распавялі пра новую экспазіцыю ў мясцовым культурніцкім цэнтры – галерэі шырока вядомага ў Беларусі і па-за яе межамі мастака Леаніда Шчамялёва.

Вартаўніцы паведамілі, што яны не дазваляюць распаўсюд менавіта “ВС” і ў якасці прыклада сапраўдных газет назвалі “Советскую Белоруссию”, для якой заўсёды “зялёная вуліца”. Факт паказальны. Ён наводзіць на думкі пра дыскрымінацыю недзяржаўных выданняў, што з’яўляецца парушэннем Закону. Жанчыны, якія сочаць за парадкам у пад’ездзе далі зразумець, што гэта распараджэнне ці то міліцыі, ці то вышэйшага начальства.

Рэдакцыя намерана высвятляць, што гэта было: падвоеныя стандарты ў адносінах да прэсы асобна ўзятых пільных вартаўніц альбо заганная сістэма перакрыцця доступу жыхароў Серабранкі да незалежнай інфармацыі.

**Тацяна Таполя**

КОНКУРС

# “Срэбраная Зорка”

Конкурс прыгажосці з такой назвай абвяшчае на старонках газеты рэдакцыя “ВС” сярод жыхарак Серабранкі.

Ён прысвячаецца надыходу вясны.



МАЛЮНАК ЮРАСЯ НАВІЦКАГА

Не сакрэт, што цёплыя дзянькі дазваляюць паненкам апранацца больш лёгка і выглядаць, адпаведна, яшчэ больш прыгожа і прываблна. Цяпер у Вас з’яўляецца шанец падзяліцца сваёй цёплай сонечнай усмешкай з чытачамі газеты – найпрыгажэйшыя здымкі будуць надрукаваныя ў наступным нумары, а таксама на сайце **http://serabranka.at.tut.by**.

Чакаем на Вашыя фота. Дасылайце лепшае на **serabranka@tut.by**. Калі ласка, сачыце, каб лісты былі не большыя за 2 Мб.

ПЫТАННІ І АДКАЗЫ

# Паліш у пад’ездзе? Плаці штраф

Наша чытачка Ала Асадчая пытаецца, ці можна паленне ў пад’ездах разглядаць як парушэнне? Як яго забараніць?

Па нашай просьбе на пытанне адказвае прадстаўнік УУС Мінаблвыканкама падпалкоўнік **Вадзім Сіняўскі**:

– За паленне ў грамадскіх месцах ёсць адміністратыўная адказнасць – артыкул 17.9 Кодэкса пра адміністратыўныя парушэнні РБ. Штраф ад 0,1 да паловы базавай велічыні. Пратаколы складаюць і разглядаюць органы ўнутраных спраў. У пад’ездах, на лесвічных пляцоўках і на балконах агульнага карыстання паліць забаронена.

ПАРТНЁРСКАЯ РЭКЛАМА

Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка камунікат www.kamunikat.org

Не забывайцеся, што pdf-версію Вашай газеты магчыма спампаваць у інтэрнэце: **http://kamunikat.org/volnaja_sierabranka.html** Адрас сайта газеткі **http://serabranka.at.tut.by** Свае допісы дасылайце, калі ласка, на скрынку **serabranka@tut.by**

РОДНАЕ СЛОВА

# Чытайце беларускае! А дзе?

**Перагледзеўшы каля 300 адзінак друкаванай прадукцыі ў шапіках Белсаюздруку, карэспандэнт "ВС" знайшоў толькі адну газету на мове тытульнай нацыі – "Нашу Ніву".**

Да таго ж, "НН" у шапіках "Белсаюздруку" з'явілася толькі ў канцы мінулага года, напачатку "лібералізацыі", калі нашай скурчанай эканоміцы спатрэбіліся заходнія крэдыты. Дапытлівы карэспандэнт знайшоў яшчэ дзве газеткі з беларускімі назовамі: "Рэспубліка" і "Паляўнічы і рыбалоў", якія на праверку аказаліся звыклымі падробкамі. Нават з агляду іх першых палос стала зразумела, што друкуюцца яны на мове рускай.


МАЛЮНАК ЮРАСЯ НАВІЦКАГА

Ні на які прыярытэт беларускай мовы гэта не падобна, няма гаворкі нават пра парытэт, то бок пра роўнасць моў.

Годам раней мы на запыт беларускамоўных чытачоў ГРУП "Белсаюздрук" адказваў наступным чынам: "…Прадпрыемства клапоціцца пра наяўнасць у рознічным продажы і беларускамоўных выданняў, і іншых тавараў беларускіх вытворцаў. У кіёсках "Белсаюздруку" прадстаўлены, напрыклад, такія беларускамоўныя выданні, як газеты "Звязда", "Літаратура і мастацтва", "Культура", часопісы "Полымя", "Маладосць", "Вясёлка", "Бярозка", "Беларускі гістарычны часопіс" і многія другія…"

Нават калі б так і было насамрэч, пералічанага яўна недастаткова нават для парытэту, калі не прымаць да ведама той факт, што абсалютная большасць насельнікаў Беларусі лічыць сваёй роднай мовай менавіта беларускую. Але нам падаецца, што праўды ў гэтым адказе роўна столькі ж, колькі і ў сёлетнім адказе "Белпошты" на скаргу жыхара Серабранкі на адсутнасць у продажы беларускіх святочных канвертаў і паштовак (нават адказ беларусу прыйшоў на рускай мове): "…Республика Беларусь проявляет государственную заботу о свободном развитии и употреблении всех национальных языков, которыми пользуется население республики (ст. 2 Закона Республики Беларусь "О языках в Республике Беларусь")..."

21 лютага суверэнная Рэспубліка Беларусь з ініцыятывы ЮНЭСКА ўжо дзесяты год святкуе Міжнародны дзень роднай мовы. Быццам у насмешку напярэдадні Дня райвыканкам ініцыяваў шматнакладны і шматколерны спецвыпуск «Наш район. ЛЕНИНСКИЙ». Ані згадкі пра свята, ані адно-адзінага слоўца па-беларуску.

**Георгій Касінскі**

ВЕРШЫ ВЯСНЫ

## Жанчынам беларускае свабоды

Няхай мужчыны вам заўсёды дораць кветкі
Штодзённа, не шукаючы нагоды,
Свае й чужыя радуюць хай дзеткі
Жанчынаў беларускае свабоды.

Якія б катаклізмы не рабіліся,
Няхай вас абмінаюць усе нягоды.
Каб нават і слязінкі не пралілася
Ў жанчынаў беларускае свабоды.

## Вясна прыйдзе!

Уж адзвінелі першыя капежы.
Здае зіма, узнаўляецца ўсё ў свеце.
А ручаі Вясны, як і належыць,
Бягуць да вольных рэк, змываюць смецце.

Так Кветка-Беларусь павінна адрадзіцца
І месца годнае заняць сярод краін свабодных.
Шыпшынай белаю між іншых засвяціцца,
Лілеяю вазёр блакітных нашых родных.

**Юрка Шпак**

КНІГАРНЯ

# Новая кніга прафесара Шыбекі

**Пабачыла свет новая кніга нашага знанага серабранаўца, урбаніста і краязнаўцы, доктара гістарычных навук Захара Васілевіча Шыбекі.**




Яна выйшла з друку ў выдавецтве Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта ў Вільні. Кніга "Гарадская цывілізацыя: Беларусь і свет" мае 372 старонкі, складаецца з раздзелаў: гісторыя горада, урбанізацыя, гараджане. Гісторыя гарадоў Беларусі і свету паказаная храналагічна, паралельна і параўнальна.

Праблемы сучаснай Беларусі паказваюцца з рэтраспектывамі ў мінулае (пачынаючы ад III тысячагоддзя да нашай эры!) і ў кантэксце сусветных працэсаў. Урбанізацыя даследуецца ў сувязі з развіццём эканомікі і гарадской культуры, узаемаадносінамі вялікіх і малых гарадоў і дамінантнай роляй сталіцы.

Аўтар разглядае такія аспекты, як ментальнасць гараджанаў, гарадскі камфорт, гарадское самакіраванне і горадабудаўнічая палітыка. Кніга вельмі цікавая і карысная не толькі студэнцкай моладзі, але шырокаму колу чытачоў.

**Таццяна Таполя**

КІНАЗАЛЯ

# Пякотнае сонца Аўстраліі

Каляровая 163-хвілінная эпічная драма "Аўстралія" (**Australia**) вытворчасці Аўстралія–ЗША ("ХХ ст. Фокс"), 2008. У галоўных ролях: Ніколь Кідман, Х'ю Джэкмэн.

Гераіня стужкі, англічанка Сары Эшлі, прыехаўшы на сваё фермерскае ранча ў Аўстраліі, знаходзіць там забітага мужа і злодзеяў, якія раскрадаюць лепшых быкоў з цяпер ужо ейнага статку. Сара, пераступаючы праз плёткі, звычаі кансерватыўнага грамадства былой калоніі і расавыя забабоны, робіць сябе і гісторыю сваёй новай радзімы.

Адчуваецца амаль няўлоўная асацыяцыя між Сараю Эшлі і Скарлет са "Знесеных ветрам". Тут таксама каханне (толькі да чалавека ніжэйшага рангу – пагоншчыка Дровера) і вайна (толькі іншая і ў іншы час), хапае і гісторыі, і драматычных, рамантычных ды камічных сцэнаў. Расповед вядзецца ад імя хлопчыка, напаўбелага, напаўабарыгена.

Атрымалася больш сучасная і з дамешкам экзатычнасці, даволі прыдатная для кінагурманаў страва. Гэтую стужку сапраўды варта паглядзець.

# Святло праўды

У офісе актывістаў дэмакратычнага руху Серабранкі адбыўся першы ў Беларусі прагон мастацкае стужкі "Насуперак" (**Defiance. The true story**), зняты па кнізе Нэхамы Тэц "Партызаны Бельскія".

Замежныя кінааналітыкі і гісторыкі ўжо паспелі раскрытыкаваць твор рэжысёра Эдуарда Цвіка за тое, што праўда аб падзеях Другой сусветнай вайны на беларускіх землях адлюстравана не ў поўным аб'ёме. Але айчыннаму гледачу, якога дасюль выхоўваюць кінафільмамі амаль што выключна ў савецка-імперскіх традыцыях, новая стужка будзе сапраўдным адкрыццём.

Перад братамі Бельскімі, якія, каб пазбегнуць Халакосту, разам з іншымі яўрэямі ўцякаюць у беларускія пушчы, паўстае дылема: пачаць збройную барацьбу на баку камуністычных партызанаў, пакінуўшы на волю лёсу старых, хворых, жанчын і дзяцей, альбо наадварот, унікнуўшы знішчальных баёў, паспрабаваць вырataваць парэшткі свайго народа. Кожны робіць свой свядомы выбар…

137-хвілінная каляровая стужка, знятая студыяй "Paramount" летась на тэрыторыі Летувіскае Рэспублікі, перакладзеная пакуль што толькі на рускую мову, але партызанская песня "Купалінка" там гучыць па-беларуску. Галоўнага героя Тувію Бельскага сыграў там выканаўца ролі апошняга Джэймса Бонда Дэніел Крэйг.

У суполцы дэмактывістаў Серабранкі маецца падборка беларускіх, польскіх і ўкраінскіх мастацкіх і дакументальных стужак (больш за 30) на тэму нашай супольнай гісторыі на беларускай і рускай мовах, беларускія аўдыёзапісы, канцэрты і чытанкі розных фарматаў. Частка іх будзе прэзентаваная пераможцам віктарыны, якая будзе праведзена рэдакцыяй у бліжэйшай будучыні. Штосьці цікаўны чытач "ВС" можна атрымаць, даслаўшы запыт на serabranka@tut.by.

**Кінамеханік**

**У калаж таксама трапіў кадр з фільма International, паказ якога ў кіно "Салют" закончыўся.**




КАЛАЖ АРТУРА ЛАГОДНАГА

Мясцовае недзяржаўнае грамадска-палітычнае выданне "Вольная Серабранка"
Выдавец і заснавальнік – супольнасць дэмакратычных актывістаў Ленінскага раёна г. Мінска.
Друкуецца пры падтрымцы ЦВІ г. Мінска.
За змест матэрыялаў адказваюць аўтары.

Галоўны рэдактар – Артур Бацькавіч Лагодны.
**Пры выкарыстанні матэрыялаў і фотаздымкаў "ВС" спасылка абавязковая!**
Газета выдаецца на беларускай мове сучасным правапісам
Капіяванне газеты і распаўсюд сярод сваякоў і знаёмых вітаецца.

Рукапісы дасланыя ў рэдакцыю не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Інтэрнет-старонка: http://serabranka.at.tut.by
Рэдакцыйны інтэрнет-адрас: serabranka@tut.by
Адрас для карэспандэнцыі:
*Мінск, Машэрава, 8 (Управа ПБНФ), для рэдактара "ВС"*

Рэдакцыйны тэлефон: (8-029)9625143
**РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА БЯСПЛАТНА**
Наклад 299 экз. (дадаткова 1). Замова № 33.
Падпісана да друку ў 1:26 19.03.2009 г.